НАШ КАЛЯНДАР

# Да 120-годдзя з дня нараджэння Я. Р. Брайцава



19 лютага 1861 года ў сям'і прыгонных Рамана Рыгоравіча і яго жонкі Еўдакіі Фамішны Брайцавых у с. Забялышына Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні нарадзіўся першынец, якога назвалі Якавам.

Учарашні прыгонны Раман Рыгоравіч Брайцаў разумеў неабходнасць даць сыну хоць бы невялікую адукацыю. Якаў закончыў Забялышынскае сельскае вучылішча і двухгадовае павятовае вучылішча ў Клімавічах. Затым стаў памочнікам пісара валаснога праўлення ў родным сяле. Якаў Брайцаў бачыў пры гэтым многа сялянскіх судовых спраў, судзебную ва-

Літаратурная спадчына Я. Р. Брайцава складаецца не толькі з вялікай друкаванай аповесці «Багацеі», а і рамана «Сярод балот і лясоў», аповесцяў «Няўдашачка Анюта», «Гаспадар», расказа «Дудалёва лаза» напісаных па мясцовых матэрыялах. У «Сялянскай газеце» ім былі надрукаваны многія артыкулы, пісаў ён і вершы.

Рукапісы твораў Я. Р. Брайцава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Васіль Раманавіч Брайцаў перадаў сынам пісьменніка, некаторыя ў Мінск, у архіў літаратуры і мастацтва.

Тыпічным творам Я. Р. Брайцава з'яўляецца аповесць «Багацеі», у якой ён апісвае жыццё двух братоў.

Вось і зараз ляжыць перада мною гэта аповесць. Яе фотакопію прыслаў мне сын нашага земляка Васіль Якаўлевіч. Асобныя лісты фотабумагі з тэкстам я пераплёў, атрымалася кніга. Яе вельмі многія чыталі ў Забялышыне. Па нашай просьбе Васіль Якаўлевіч даслаў таксама машынапісныя тэксты рамана «Сярод балот і лясоў» і аповесці «Няўдашачка Анюта». Я іх пераплёў як кнігі. Іх чыталі і чытаюць зараз у Забялышыне, Трасціно, Хоцімску.

20 гадоў Якаў Раманавіч жыў у Маскве. Сялянскага

лакіту, крыўды сялян на памешчыкаў. Бацька хацеў, каб сын стаў валасным пісарам. Але Якаў марыў стаць пісьменнікам.

Насуперак волі бацькі ён паехаў у Маскву, маючы кішэні ўсяго адзін рубель. Хутка юнак уладкаваўся перапісчыкам судовых спраў у прысяжнага паверанага. Побач была Румянцаўская бібліятэка. Увесь вольны час Якаў Брайцаў праводзіць тут, многа чытае, наведвае тэатры, упарта ідучы да мэты. У прысяжнага ён спасцігнуў тайны судовых спраў, на практыцы пазнаў законы і юрыдычныя навукі.

Хутка ён становіцца старшым бухгалтарам вядомага маскоўскага багацея, кветкавода Ноева. Працягвае літаратурную працу. У 1899 годзе выходзіць у свет яго першая аповесць «Багацеі», у якой аўтар паказвае простанароднае жыццё беларускіх сялян. Выданне аповесці, умацаванне яго матэрыяльнага становішча далі магчымасць дапамагчы вучыцца яго малодшым братам Івану і Васілю.

Выключныя здольнасці да навук дазволілі ім дасягнуць вялікіх поспехаў. Малодшы брат, Іван Раманавіч, стаў доктарам матэматычных навук, у апошнія гады быў прафесарам Горкаўскага ўніверсітэта. Васіль Раманавіч быў сапраўдным членам Ака-

пісьменніка пацягнула на радзіму. Памерлі бацькі. Ён зноў у Забялышыне і працягвае літаратурную дзейнасць. З часам набыў славу адваката па сялянскіх справах, быў добрым прамоўцам і ў судах заўсёды адстойваў справы ў карысць сялян. Якаў Раманавіч быў бясплатным і безадказным хадайнікам за абяздоленых беднякоў. Больш вядомага і аўтарытэтнага сярод сялян чалавека не было ва ўсім Клімавіцкім павеце.

У перыяд рэвалюцыйных падзей 1905 г. Брайцаў падвяргаўся вобыскам. Ён захоўваў нелегальную літаратуру і знаходзіўся пад наглядам паліцыі.

Раман «Сярод балот і лясоў» ён напісаў у 1913—1916 гадах. Працаваў у сваёй сялянскай хаце, пісаў вечарамі пры невялікай газнічцы.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года працаваў сакратаром Забялышынскага валвыканкома, потым сакратаром Клімавіцкага павятовага выканкома. У 1920-22 г. г. састаяў у калегіі павятовага аддзела сацзабеспячэння, потым у зямельным аддзеле. У сувязі з пагаршэннем здароўя зноў вярнуўся ў Забялышына. У 1925—27 гадах выкладаў курс земляробства ў Забялышынскай школе сельскай моладзі. Дарэчы, у той час ён і напісаў аповесць «Гаспадар». Час калгаснага будаўніцтва застаў яго цяжка хворым.

дэміі медыцынскіх навук СССР, заслужаным дзеячам навук, прафесарам.

Як пісьменнік, Якаў Раманавіч Брайцаў фарміраваўся пад уплывам твораў Л. М. Талстога. Тургенева, Дастаеўскага і іншых буйных рускіх пісьменнікаў.

Акадэмік Е. Ф. Карскі ў 3-ім выданні III тома ў рабоце «Беларусы» (1922 г.) адзначыў твор Я. Р. Брайцава «Багацеі», як таленавітую аповесць.

Пісьменнік памёр у Забялышынскай бальніцы 2 сакавіка 1931 года ад запалення лёгкіх. Пахаваны на мясцовым могільніку сярод магіл сялян, чые інтарэсы заўсёды абараняў, хто служыў правобразам герояў яго твораў.

Біяграфія Я. Р. Брайцава занесена ў кнігу Гонару раёна. Імем братоў Брайцавых названа ў Хоцімску адна з вуліц.

*І. КІСЯЛЁЎ*,
настаўнік-пенсіянер,
краязнаўца, в. Забялышына.

**Кісялёў, І.** Да 120-годдзя з дня нараджэння Я. Р. Брайцава / І. Кісялёў // Шлях Кастрычніка. — 1981. — 19 лютага.